Лазько, Р. Р. Матэрыялы з беларускіх архіваў аб еўрапейскай палітыцы: СССР у пачатку Другой сусветнай вайны / Р. Р. Лазько // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб.  Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 117–120.

***Р. Р. ЛАЗЬКО***

# МАТЭРЫЯЛЫ З БЕЛАРУСКІХ АРХІВАЎ АБ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ СССР У ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Беларускія даследчыкі гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы міжваеннага часу і міжнародных адносін яшчэ нядаўна не звярталі належнай увагі на матэрыялы мясцовых, беларускіх архіваў. Аднак у апошнія гады ў гэтым накірунку пачаліся істотныя зрухі. Ім садзейнічалі, з аднаго боку, цяжкасці ў доступе да маскоўскіх архіваў, узнікшыя пасля таго, як яны апынуліся за дзяржаўнай мяжой, а з другога — узросшае сярод гісторыкаў разуменне ролі геапалітычных фактараў у лёсе беларускага народа, асабліва на такіх паваротах сусветнай гісторыі, як тыя, што пазначаны датамі 1918—1921, 1939 гг. Матэрыялы з беларускіх архіваў дазваляюць паглыбіць вывучэнне якраз такіх паваротных падзей сусветнай гісторыі, якія ўцягвалі ў свой вірлівы паток і Беларусь. Да гэтых падзей адносяцца і тыя, што разгортва-



ліся ў трохкутніку Берлін — Масква — Варшава пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. Звернем увагу на асобныя дакументы, ужо сёння трапіўшыя ў поле зроку, якія звязаны з гэтымі падзеямі і могуць даць уяўленне аб інфармацыйных магчымасцях усяго масіву матэрыялу з беларускіх архіваў. Гаворка ідзе, перш за ўсё, аб дакументах кіруючых партыйных органаў БССР — Бюро ЦК КП(б)Б і абкомаў партыі, а таксама дзяржаўных устаноў, якія кантраляваліся партыяй.

Найбольш багатым сховішчам дакументаў названай тэматыкі з'яўляецца Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Сярод дакументаў НАРБ, у якіх знайшла адлюстраванне еўрапейская палітыка СССР пасля 23 верасня 1939 г., найбольш карыснымі аказаліся матэрыялы Бюро ЦК КП(б)Б, аб'яднаныя вопісамі № 3, 11, 21 у фондзе гэтай установы. Гэта сотні адзінак захоўвання, якія ўключаюць не толькі дакументы кіруючых партыйных органаў, але і матэрыялы іншых арганізацый, у прыватнасці Народнага камісарыята ўнутраных спраў. Асобныя з гэтых дакументаў, пры супастаўленні іх з вядомымі крыніцамі, праліваюць святло на няясныя да гэтага часу пытанні савецкай палітыкі ў Еўропе.

Адзін з такіх дакументаў — пастанова ЦК КП(б)Б «Об осоавиахимовских постах воздушного наблюдения, оповещения и связи (ВНОС) при сельсоветах», прынятая на пасяджэнні Бюро ЦК 26—27 жніўня 1939 г.[1] Гэтай пастановай перад райкомамі партыі была пастаўлена задача арганізаваць пры ўсіх сельсаветах пасты для назірання за самалётамі, дырыжаблямі, аэрастатамі, якія з'яўляюцца ў паветры, вызначэння іх прыналежнасці, тыпу і накірунку палёту і неадкладнага паведамлення аб іх у вышэйшы пункт сувязі. Работу па стварэнні гэтых пастоў неабходна было закончыць да 1 кастрычніка. Нельга не заўважыць, што пастанова была прынята праз некалькі дзён пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзенні з яго сакрэтным дадатковым пратаколам, якім вызначаўся лёс краін Усходняй Еўропы на бліжэйшыя гады. Безумоўна, ініцыятыва прыняцця гэтай пастановы зыходзіла не з Мінска, а з Масквы, дзе ўжо ведалі аб маючым адбыцца нападзенні Германіі на Польшчу. Можна зразумець, што назіральныя пасты пры ўсіх сельсаветах ствараліся не толькі дзеля перасцярогі, але і дзеля вывучэння ваенна-паветраных сіл патэнцыяльных праціўнікаў СССР: бліжэйшага — Польшчы і перспектыўнага — Германіі.

Гэты дакумент цікавы яшчэ з аднаго пункта гледжання: ён сведчыць, што ў Маскве разлічвалі на больш працяглую вайну паміж Германіяй і Польшчай, чым гэта аказалася на самой справе, бо тэрмін для выканання пастановы быў устаноўлены даволі працяглы. Але поспехі Германіі ў вайне супраць Польшчы прымусілі партыйныя інстанцыі паспяшацца з выкананнем пас-



тановы ЦК КП(б)Б. 10 верасня бюро Палескага абкома прыняло рашэнне «неадкладна прыступіць» да арганізацыі асаавіяхімаўскіх пастоў. Тут жа знаходзіцца важнае сведчанне іх назначэння — у дапамогу вайсковым адзінкам РККА[2]. У гэтыя дні Чырвоная Армія ўжо рыхтавалася да ўступлення ў Польшчу, поўным ходам ішла мабілізацыя запасных. Крыху забягаючы наперад, заўважым, што пастанова ЦК КП(б)Б была выканана дрэнна: аб гэтым сведчыла праверка, праведзеная Палескім абкомам партыі. У пастанове яго бюро ад 8 кастрычніка канстатавалася, што ў шэрагу сельсаветаў нават не прыступілі да выканання гэтай пастановы[3].

Цікавую інфармацыю даюць матэрыялы былога «асобага сектара» ЦК КП(б)Б, у якіх прасочваецца мабілізацыя запасных у шэрагі Чырвонай Арміі. Яны сведчаць, што падрыхтоўка Чырвонай Арміі да

ўступлення ў межы Польшчы пачалася загадзя — ужо ўвечары 6 верасня аблваенкаматы атрымалі папярэджанне аб мабілізацыі, а на наступны дзень пачалі яе. Але з тых жа матэрыялаў відаць, што раней гэтай даты «паход на Захад» не рыхтаваўся, аб чым сведчыць надзвычайная неарганізаванасць у правядзенні мабілізацыі, непадрыхтаванасць часцей да прыёму запасных. Можна меркаваць, што толькі нечаканае хуткае для Крамля разгортванне падзей у Польшчы, пасіўнасць яе заходніх саюзнікаў і вядомы з апублікаваных крыніц націск на Маскву з боку Германіі прымусілі савецкі ўрад паспяшацца з уводам Чырвонай Арміі. Як і гісторыя з назіральнымі пастамі, непадрыхтаванасць гэтай акцыі сведчыць, відавочна, аб спадзяваннях Масквы на зацяжную вайну паміж Германіяй і яе праціўнікамі, але, з другога боку, яна з’яўляецца і сведчаннем хібаў савецкай мабілізацыйнай сістэмы.

У фондах НАРБ захоўваецца комплекс дакументаў, якія дазваляюць з большай адпаведнасцю ацаніць і характар той улады, якая сфарміравалася ў Заходняй Беларусі пасля ўступлення Чырвонай Арміі на яе тэрыторыю. Хаця гэта пытанне ўжо разглядалася Г. Д. Кнацько — разглядалася менавіта на аснове матэрыялаў НАРБ[4], але, відавочна, яе публікацыя засталася малавядомай беларускім даследчыкам. Аб гэтым можна меркаваць на падставе больш позніх публікацый, у якіх выказваецца ацэнка часовых упраўленняў гарадоў і паветаў у Заходняй Беларусі як органаў новай, дэмакратычнай улады[5]. Як на самой справе фарміраваліся гэтыя органы ўлады, распавёў першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка на сходзе мінскага гарадскога партыйнага актыву 12 кастрычніка 1939 г. Захавалася стэнаграма яго даклада, выпраўленая, напэўна, самім Панамарэнкам. «На чале гэтых часовых упраўленняў, — гаварыў першы сакратар ЦК КП(б)Б, — стаяць прадстаўнікі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі (далей ідзе фрагмент, выкраслены са стэнаграмы. — *Р. Л.*), гэта значыць, партыйныя і савецкія



работнікі, якіх мы ў парадку падрыхтоўкі (падкрэслена мною. — *Р. Л.*) пераапранулі ў вайсковую форму (шум у зале, апладысменты)»[6]. З гэтага ж дакумента можна даведацца, што, акрамя старшынь, у склад усіх часовых упраўленняў прызначаліся супрацоўнікі НКУС, а таксама два прадстаўнікі мясцовых рабочых і левай інтэлігенцыі. У першапачатковым варыянце тэксту гэтыя прадстаўнікі нават не называліся членамі часовых упраўленняў. Прадстаўнікі сялян (у абласных, павятовых упраўленнях, дзе, здавалася б, іх неабходна было мець) нават не згадваліся. Ясна, што аб дэмакратызме гэтых органаў улады не даводзіцца гаварыць. Яны былі прынесены ў Заходнюю Беларусь Чырвонай Арміяй.

Нават гэты фрагментарны агляд дазваляе зрабіць выснову, што на фонды беларускіх архіваў варта звярнуць увагу не толькі спецыялістам па гісторыі Беларусі. Іх матэрыялы здольныя ўзбагаціць базу крыніц для вывучэння шэрага праблем сусветнай гісторыі навейшага часу і нават могуць стаць істотнымі для разумення асобных з гэтых праблем. Да іх адносяцца, у першую чаргу, пытанні савецка-германскіх адносін на пачатковым этапе Другой сусветнай вайны і звязаны з гэтымі адносінамі лёс польскай дзяржавы, а таксама праблема аб’яднання Беларусі ў кантэксце тагачаснай міжнароднай палітыкі.

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4. Воп. 3. Спр. 770. С. 47-48.
[2] Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці. Ф. 702. Воп. 1. Спр. 54. С. 121.
[3] ДзАГА Гомельскай вобласці. Ф. 702. Воп. 1. Спр. 55. С. 64.
[4] Spoieczecstwo biaioruskie, litewskie i polskie na ziemiach pylnocno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej (Bialoruś Zachodnia i Litwa Wschodnia w latach 1939—1941). Warszawa, 1995. C. 99-102.
[5] *Ладысеў, У. Л.* Ваенныя падзеі верасня 1939 года ў лёсе беларускага народа / У. Л. Ладысеў // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 7.
[6] НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 1584. С. 32.